## Інстытут інклюзіўнай адукацыі БДПУ

# Метады навучання і выхавання вучняў з парушэннем слыху



Прэзентацыю падрыхтавалі:
дацэнт Кісялёва А.В.,
студэнтка 204 гр. Агеева А.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Метад** - асноўны спосаб ўзаемадзеяння настаўніка і вучня (выхавальніка і выхаванца), накіраваны на рашэнне канкрэтнай задачы педагагічнага працэсу.

---

**Прыём** - дадатковы спосаб, накіраваны на павышэнне эфектыўнасці метаду.

**Метады**, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе навучання дзяцей з парушэннем слыху, **умоўна можна падзяліць на тры групы: агульныя (агульнапедагагічныя), спецыяльныя і спецыфічныя.**





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



**Агульнапедагагічныя метады** – гэта тыя, якія выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе ва ўсіх тыпах навучальных устаноў, у тым ліку і ў масавай школе, пры вывучэнні ўсіх прадметаў, пры навучанні любой катэгорыі навучэнцаў.

**Спецыяльныя метады** прымяняюцца пры вывучэнні таго ці іншага вучэбнага прадмета, прадугледжанага вучэбным планам школы для дзяцей з парушэннем слыху. Характэрныя асаблівасці зместу вучэбнага матэрыялу і асаблівасці засваення яго навучэнцамі з парушэннем слыху абумоўліваюць неабходнасць выкарыстання адмысловых метадаў, метадычных прыёмаў і арганізацыйных формаў навучання.

**Да спецыфічных адносяць метады**, якія выкарыстоўваюцца сурдапедагогамі ў спецыфічных раздзелах работы (фарміраванне славеснай мовы нячуючых навучэнцаў як сродку зносін, развіццё слыхавога ўспрымання, навучанне чытанню з вуснаў і вымаўленню і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Існуе некалькі варыянтаў класіфікацыі агульных метадаў навучання ў залежнасці ад прыкметы, пакладзенай у яе аснову (Ю. Бабанскі, І. Лернер, М. Махмутаў, М. Скаткин і інш.).

---

Найбольш распаўсюджанай з'яўляецца **класіфікацыя па крыніцы ведаў (па крыніцы інфармацыі): славесныя, наглядныя, практычныя метады**, што абумоўлена фізіялагічнымі і псіхалагічнымі асаблівасцямі навучэнцаў з парушэннем слыху.

У сувязі з узмацненнем увагі да развіцця актыўнасці, самастойнасці ды творчасці навучэнцаў распрацавана **класіфікацыя метадаў у адпаведнасці з характарам пазнавальнай дзейнасці (па ўзроўню пазнавальнай дзейнасці вучняў): інфармацыйна-рэцэптыўны (або тлумачальна-ілюстрацыйны), інструктыўна-рэпрадуктыўны, метад праблемнага выкладання, эўрыстычны, даследчы.**

Класіфікацыя часта з'яўляецца зыходнай пры правядзенні эксперыментальных даследванняў, прысвечаных праблеме ўдасканалення адукацыйнага працэсу ў спецыяльнай школе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Па спосабе дзейнасці настаўніка і вучня:** метады вуснага выкладання, праца вучняў, назіранні навучэнцаў.

---

**Класіфікацыя метадаў у залежнасці ад асноўных дыдактычных задач і этапаў працэсу навучання**: метады падрыхтоўкі вучняў да засваення вучэбнага матэрыялу, набыцця ведаў, фарміравання ўменняў і навыкаў, замацавання і прымянення ведаў, праверкі ведаў, уменняў і навыкаў.

**Па дыдактычнай мэце**: метады паведамлення новых ведаў, метады замацавання ведаў, метады праверкі і ацэнкі ведаў.



**Класіфікацыя метадаў у адпаведнасці з логікай пазнання:** аналітычны, сінтэтычны, аналітыка-сінтэтычны, індуктыўны, дэдуктыўны, індуктыўна-дэдуктыўны, метады параўнання, аналогіі, абагульнення, абстрагавання і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Усе названыя класіфікацыі будуюцца пераважна на падставе нейкай адной істотнай прыкметы.

---

Найбольш поўная **класіфікацыя метадаў навучання на падставе цэласнага падыходу да працэсу навучання** (спалучэнне розных падыходаў - **комплексны падыход Ю.К. Бабанскага**):

- метады арганізацыі і ажыццяўлення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці,
- стымулявання і матывацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці,
- метады кантролю і самакантролю.

Кожная з названых груп падзяляецца на падгрупы.

У групе метадаў арганізацыі і ажыццяўлення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ўлічаны розныя аспекты:

- перадача і ўспрыманне вучэбнай інфармацыі (славесныя, наглядныя, практычныя метады),
- лагічны аспект (індуктыўныя і дэдуктыўныя метады),
- характар пазнавальнай дзейнасці (рэпрадуктыўныя і праблемна-пошукавыя метады),
- аспект кіравання працэсам навучання (метады самастойнай працы і працы пад кіраўніцтвам настаўніка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Метады кантролю

**Метады вуснага кантролю:** гутарка, расказ, тлумачэнне, каментаванае чытанне тэксту падручніка, чытанне схемы, тэхналагічнай карты, паведамленне, апытанне і інш.

**Метады пісьмовага кантролю**: хатнія пісьмовыя работы, дыктоўкі, кантрольныя работы, выкладанні, сачыненні, рэферат і інш.

**Выкананне лабараторных і практычных работ.**

**Назіранне.**

**Дыдактычныя тэсты і інш.**






РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Спецыяльныя метады прымяняюцца пры вывучэнні пэўных навучальных прадметаў, прадугледжаных вучэбным планам школы для дзяцей з парушэннем слыху.**

**Пры навучанні мове** нячуючых і слабачуючых навучэнцаў **выкарыстоўваюцца** розныя **метады і прыёмы** (С.А. Зыкаў, А.Г. Зікееў, Л.П. Наскова):

**- сістэматычныя і мэтанакіраваныя назіранні фактаў і з'яў моўнай рэчаіснасці,**

**- шырокае іх супастаўленне,**

**- выяўленне розных сувязяў і адносін паміж адзінкамі розных узроўняў,**

**- абагульненне на падставе выяўлення істотных бакоў і прыкмет,**

**- падвядзенне адзінкавых фактаў пад пэўныя катэгорыі і інш.**



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**На ўроках літаратурнага чытання выкарыстоўваюцца наступныя метады (М.І. Нікіціна):**

- **рэпрадуктыўныя** (фактэлагічная гутарка, падрабязны пераказ, чытанне настаўніка ці вучняў, сузіранне ілюстрацый, прагляд фільма, дзеянне па макету (або аплікацыі, карціне), ілюстраванне, складанне карціннага плана, вылучэнне новых слоў);
- **эўрыстычныя** (аналітычная гутарка, расказ вучня, пераказ з лексіка-граматычным заданнем, выбарачнае і выразнае чытанне, апісанне ілюстрацый, аналітычнае меркаванне пра фільм, пераказ сюжэту па аплікацыі (макету), супастаўленне ілюстрацый або малюнкаў дзяцей, пераказ па карціннаму плану, тлумачэнне новай лексікі, выкананне лексіка-стылістычных практыкаванняў, слоўнае маляванне, складанне плана, апавяданні дзяцей з апорай на пытанні ці план);
- **творчыя** (праблемная гутарка, сачыненні, казкі, загадкі, працяг аповяду, чытанне па ролях, супастаўленне твораў розных аўтараў, складанне сцэнара, прыдумванне лёсу персанажа, пастаноўка спектакля, падрыхтоўка свята кнігі, аналітычныя меркаванні пра персанажаў або па кнізе, самастойныя апавяданні дзяцей) .

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Спецыфічныя метады** выкарыстоўваюцца сурдапедагогамі ў працэсе правядзення **спецыфічных раздзелаў работы** (фарміраванне славеснай мовы нячуючых і слабачуючых навучэнцаў як сродку зносін, развіццё і выкарыстанне слыхавога ўспрымання, навучанне чытанню з вуснаў і вымаўленню і інш.).

**У прыватнасці, метады навучання вымаўленню дзяцей з парушэннем слыху ўяўляюць сабой адзінства аналітыка-сінтэтычнага метада, канцэнтрычнага, палісянсорнага.**

**Аналітыка-сінтэтычны метад** прадугледжвае такую пабудову навучання, калі пры фарміраванні і карэкцыі вымаўленчых навыкаў праца над цэлым словам спалучаецца з адпрацоўкай яго асобных элементаў. Выкарыстоўваецца прыём раскладання слоў, якія прадстаўляюць пэўныя цяжкасці ў вымаўленні для вучня, на склады, фанемы і зліццё складоў, фанем у слова (слова → склад (гук) → слова). Зыходны і асноўны матэрыял, па якім вядзецца праца, - цэлыя словы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Канцэнтрычны метад** прадугледжвае адмысловае размяшчэнне гукавога матэрыялу. З усіх гукаў рускай мовы выбраны 17 асноўных, складаючых «скарочаную сістэму фанем» (І-ы канцэнтр гукаў). Яны павінны быць засвоены дзіцём у першую чаргу. Гукі ІІ-а канцэнтра часова могуць замяняцца асноўнымі гукамі.

**Палісянсорны метад** прадугледжвае, што для ўспрымання ўзору вымаўлення і кантролю над уласным вымаўленнем выкарыстоўваюцца ўсе аналізатары вучня.

Успрыманне фанетычных элементаў мовы складае сэнсорную базу вымаўлення і служыць неабходнай умовай для таго, каб дзіця з парушэннем слыху магло атрымліваць узоры для пераймання і кантраляваць сваё вымаўленне, злічваючы яго з узорам. Той ці іншай аналізатар можа выступаць у якасці асноўнага пры ўспрыманні вуснай мовы або выконваць функцыю дадатковага, толькі палягчаючага ўспрыманне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Метады выхавання** - сукупнасць найбольш агульных спосабаў вырашэння выхаваўчых задач і ажыццяўлення выхаваўчых узаемадзеянняў.

---

Улічваючы асаблівасці развіцця дзяцей з парушэннем слыху, была прапанавана наступная **класіфікацыя метадаў выхавання** (С. Зыкаў, К. Рэчыцкая і інш.):

- **інфармацыйныя метады** (гутарка, аповяд педагога, тлумачэнне, прагляд фільма, чытанне, прыклад, педагагічнае патрабаванне);

- **практычна-дзейсныя** (прывучванне і практыкаванне, арганізацыя грамадска карыснай дзейнасці, выхаваўчыя сітуацыі, гульня);



- **стымулюючыя** (заахвочванне і пакаранне).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КЛАСІФІКАЦЫЯ МЕТАДАЎ ВЫХАВАННЯ
## на падставе кірунку (Г.І. ШЧУКІНА)

**Метады фарміравання свядомасці**

*Перакананне*

аповяд
тлумачэнне
лекцыя
этычная гутарка
павучанне
інструктаж
дыспут
прыклад

**Метады арганізацыі дзейнасці і фарміравання вопыту паводзін**

*Практыкаванне*

прывучванне
педагагічнае патрабаванне
грамадская думка
даручэнне
выхоўваючыя сітуацыі

**Метады стымулявання**

*Матывацыя*

спаборніцтва
заахвочванне
пакаранне



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Інтэрактыўныя метады** - сукупнасць спосабаў мэтанакіраванага ўзмоцненага ўзаемадзеяння ўсіх удзельнікаў выхаваўчага працэсу, паслядоўная рэалізацыя гэтых метадаў стварае аптымальныя ўмовы для іх развіцця.

***С.С. Кашлеў класіфікуе гэтыя метады*** ў адпаведнасці з вядучай функцыяй кожнага метаду ў арганізацыі педагагічнага ўзаемадзеяння:

- **метады стварэння спрыяльнай атмасферы, арганізацыі камунікацыі** (*«Камплімент», «Імя і жэст», «Падарыце кветку», «Алітэрацыя імя», «Калі б я быў чараўніком» і інш.);*
- **метады абмену дзейнасцямі** (*«Самаацэнка», «Тузін пытанняў», «Майстэрня будучыні» і інш.);*
- **метады мыследзейнасці** (*«Выбар», «Лагічны ланцужок», «Змена суразмоўцы», «Каляровыя фігуры» і інш.);*
- **метады сэнсатворчасці** (*«Праца з паняццямі», «Алфавіт», «Асацыяцыі», «Як прыдумаць казку», «Хвіліна гаварэння», «Скончыце фразу», «Інтэлектуальныя арэлі» і інш.);*
- **метады рэфлексіўнай дзейнасці** (*«Рэфлексіўная мішэнь», «Рэфлексіўны рынг», «Ланцужок пажаданняў», «Памяняемся месцамі» і інш.);*
- **метад спаборніцтва.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ